Падтрымай "Вясну" на PATREON

Аляксея Ліпеня асудзілі на 5 гадоў "хіміі" і вызвалілі ў залі суда

13.04.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Аляксей Ліпень пасля прысуду. Фота Белсат

У судзе Заводскага раёна г. Мінска 13 красавіка быў агучаны прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да Аляксея Ліпеня. Мужчыну абвінавачвалі па двух артыкулах крымінальнага кодэкса: арт. 369 – публічная абраза прадстаўніка ўлады, і арт. 364 – пагроза прымянення гвалту ў дачыненні да супрацоўніка АУС.

Суддзя **Алег Каляда** палічыў віну Аляксея Ліпеня даказанай і асудзіў мужчыну **на пяць гадоў абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу**. Таксама абвінавачаны абавязаны сплаціць **кампенсацыю нанесенай маральнай шкоды пацярпелым супрацоўнікам міліцыі ў**

памеры 5500 рублёў і судовыя выдаткі ў памеры 522 рублі.

Да ўступлення прысуду ў сілу Аляксей Ліпень быў вызвалены з-пад варты пад падпіску аб нявыездзе і належныя паводзіны.

Нагадаем, паводле абвінавачвання, Аляксей Ліпень неаднаразова, выкарыстоўваючы розныя нікнэймы, у тым ліку «савецкі малы», пакідаў абразлівыя каментары пад фота супрацоўнікаў міліцыі ў тэлеграм-канале «Карнікі Беларусі» ў перыяд з 29 кастрычніка па 18 снежня 2020 года. Сваімі дзеяннямі ён прынізіў гонар і годнасць супрацоўнікаў міліцыі як прадстаўнікоў улады і як людзей, а таксама падарваў аўтарытэт дзяржаўнай улады.

Таксама абвінавачваны размяшчаў каментары нібыта з пагрозамі ў адрас шасці міліцыянтаў, яны прызнаныя пацярпелымі паводле арт. 364 КК.

Усяго па справе праходзіла больш за 10 пацярпелых супрацоўнікаў міліцыі.



За абразлівыя каментары і пагрозы ў адрас міліцыянтаў пракурор запрасіў 5 гадоў "хіміі"

Паводле абвінавачвання, Аляксей Ліпень неаднаразова, выкарыстоўваючы розныя нікнэймы, у тым ліку «савецкі малы», пакідаў абразлівыя каментары пад фота супрацоўнікаў міліцыі ў тэлеграм-канале «Карнікі Беларусі» ў перыяд з 29 кастрычніка па 18 снежня 2020 года.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ



Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ







ПАРТНЁРСТВА

Рацыя

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

Вытокі

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY